СТАЛІЦА
ОРДЭНАНОСНАЙ БССР

# ПАЛАЦ КНІГІ

Стары Менск меў адну толькі гарадскую пушкінскую бібліятэку. Яна лічылася самай буйнай у Паўночна-Заходнім краі і налічвала... 20.000 кніг.

Прыблізна з такой-жа колькасцю кніг пачала ў 1922 годзе сваю работу Беларуская дзяржаўная бібліятэка.

Праз 10 гадоў яна пераехала ў спецыяльна пабудаваны новы будынак на Чырвонаармейскай вуліцы. У сучасны момант Беларуская дзяржаўная бібліятэка ператварылася ў вялікі кніжны камбінат, у сапраўдны палац кнігі.

Звыш паўтара мільёна кніг знаходзіцца ў бібліятэцы. Яна атрымлівае па 1 экз. усёй кніжна-журнальнай прадукцыі, якая выпускаецца ў Советскім Саюзе. Бібліятэка звязана з дзесяткамі краін свету, з 200 замежнымі навуковымі ўстановамі і атрымлівае каля 400 навуковых замежных журналаў.

Дзяржаўная бібліятэка ўладае амаль адзіным у Саюзе зборам краязнаўчай беларускай літаратуры каля 60.000 тамоў. Апрача таго яна мае вельмі каштоўныя аддзелы літаратуры нацыянальных меншасцей: яўрэйскі — адзін з буйнейшых у Саюзе (30.000 тамоў) і польскі. Арганізуецца літоўскі аддзел.

Адно з цікавых пачынанняў бібліятэкі — гэта габінет рабочага чытача. У ім абсталявана выстаўка кніжных навінак. арганізавана кансультацыя і лекцыі па розных пытаннях.

Пры агульнай чытальні існуе спецыяльны пакой для аспірантаў. Заканчваецца абсталяванне асобных пакояў для дыпламантаў і студэнтаў старэйшых курсаў. Пры чытальні абсталявана таксама выстаўка бягучых навінак.

Апрача таго працуюць чытальня навуковых работнікаў, аддзел тэхнічнай літаратуры, чытальні пры нацыянальных аддзелах.

Бібліятэку штодзенна наведвае каля 1.000 чалавек. У мінулым годзе выдана поўмільёна кніг 287 тыс. наведвальнікам Апрача таго 1.000 чалавек атрымліваюць кнігі на дом у парадку хатняга абанемента.

Бібліятэка абслугоўвае не толькі сталіцу БССР, але і раёны 1.000 чытачоў у 74 раёнах атрымліваюць кнігі. высланыя з Менска ў часовае карыстанне мясцовым бібліятэкам.

Нарэшце, трэба ўспамянуць аб метадычным сектары і вышэйшых курсах, якія дапамагаюць павышэнню кваліфікацыі бібліятэчных работнікаў, аб бібліяграфічным інстытуце. Метадычны сектар бібліятэкі мае дзве вопытныя базы на заводзе імя Мяснікова і ў першай Менскай МТС

С. БУТОМАЎ.